Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (142), 2024

**Филология**

УДК 811.161.3’42’373.232(476.2-37Карма) EDN: JLDQXN

# Семантычныя групы прозвішчаў Кармянскага раёна

У.А. Бобрык

У артыкуле аналізуюцца семантычныя групы прозвішчаў жыхароў Кармянскага раёна. Вылучаны адзінаццаць лексіка-семантычных груп, што сталі асновай для ўтварэння прозвішчаў. У выніку аўтар даследавання прыйшоў да высновы, што найбольш ужывальнымі з’яўляюцца прозвішчы, суадносныя з назвамі прафесій, родам заняткаў, фізічнымі і фізіялагічнымі характарыстыкамі чалавека. Менш пашыраны прозвішчы, суадносныя з назвамі адзення і абутку, батанічнымі і геаграфічнымі назвамі.
**Ключавыя словы:** прозвішча, семантыка, адапелятыўнае прозвішча, адыменнае прозвішча, адтапанімічнае поле, словаўтварэнне, лексіка-семантычная група.

The article gives the semantic analysis of the surnames of the Korma region citizens. Eleven lexico-semantic groups as the basis for surname formation were singled out. As a result the researcher has come to the conclusion that the most common surnames are the ones that originated from professions, occupations, physical and physiological characteristics of a person. Fewer surnames are related to clothes and footwear, botanical and geographical names.
**Keywords:** surname, semantics, appellative surname, name surname, toponymic field, world-formation, lexico-semantic group.

Разнастайнасць беларускіх прозвішчаў абумоўлена вялікай колькасцю разнародных элементаў, выкарыстаных у якасці іх асноў. Да іх належаць як спрадвечныя, так і запазычаныя словы. Паводле стану ў мове – гэта асабовыя імёны, імёны па бацьку, імёны-мянушкі, а таксама, што не выключана, гатовыя прозвішчы, геаграфічныя назвы, назвы плямён і народаў, апелятыўная лексіка мовы. Сотнямі нябачных сувязей звязаны прозвішчы з жыццём грамадства, з яго культурай, якая складаецца з сукупнасці матэрыяльных і духоўных дасягненняў. Мова, літаратура, мастацтва, рэлігія, філасофія адносяцца да духоўнай культуры. Сам слоўнікавы склад мовы жыва рэагуе на прагрэс, адпаведна ўсё новае знаходзіць адлюстраванне ў ім. Таму ўтворанае ў тую ці іншую эпоху імя суадносіцца з яе культурнымі і гістарычнымі традыцыямі, нясе інфармацыю і выступае непаўторным помнікам свайго часу. Багацце і стракатасць асноў прозвішчаў нагадваюць энцыклапедыю мовы, штодзённага жыцця, умоў існавання, спосабаў і формаў задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб людзей.

Аналіз семантыкі і структуры прозвішчаў – цікавая, каштоўная і цяжкая справа, што прызнаецца многімі антрапаністамі. Ён, на думку А. Суперанскай, «дае значную інфармацыю, якая ўяўляе цікавасць для гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, а таксама лінгвістаў. Пры параўнанні лексічных палёў, па якіх размяркоўваюцца асновы прозвішчаў у розных мовах, можна зрабіць вывады пра агульнасць або, наадварот, рознасць нацыянальных культур асобных народаў» [1, с. 81].

Прозвішчаў адапелятыўнага паходжання ў беларускай мове даволі многа. Гэта група складае прыкладна каля паловы ўсіх прозвішчаў. Вядомы антрапаніміст М.В. Бірыла адзначае, што «з пункту погляду гісторыі мовы адапелятыўная антрапанімія з’яўляецца захавальнікам, кансервантам лексікі папярэдніх эпох, дае матэрыял для больш глыбокага вывучэння гістарычнага слоўніка, моўных узаемасувязей» [2, с. 4]. Згодна з гэтым у якасці асноў для ўтварэння прозвішчаў магла выкарыстоўвацца лексіка, якая адлюстроўвае самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа і акаляючай яго рэчаіснасці – быт, заняткі, становішча ў сям’і і грамадстве, фізічныя, разумовыя і маральныя якасці, пачуцці, сацыяльны ўклад, жывёльны і раслінны свет і пад. У гэтым сэнсе антрапанімія, утвораная ад апелятыўнай лексікі, з’яўляецца кладоўкай гісторыка-культурнай спадчыны, дае каштоўны матэрыял для вывучэння агульнай гісторыі народа. Пры ўтварэнні прозвішчаў Кармянскага раёна выкарыстоўвалася лексіка наступных семантычных груп:

**Назвы асоб па прафесіі ці занятку, сацыяльным становішчы.** Прозвішчы, утвораныя ад назваў прафесій, сведчаць пра разнастайнасць прафесій у Беларусі. З развіццём грамадства зніклі некаторыя прафесіі, а разам з імі страціліся і іх назвы, якія ляжаць у аснове прозвішчаў. Тым не менш іх этымалогія ў большасці застаецца празрыстай. Прозвішчы, што былі ўтвораны ад назваў прафесій, роду заняткаў або выконваемага дзеяння прадстаўляюць сабой каштоўную крыніцу па гісторыі мовы і культуры. *Алейнік, Алейнікаў* < алейнік ‘спецыяліст па вытворчасці алею’ [2, с. 20]; *Асадчы, Асадчык* < асадчы ‘заснавальнік паселішча’ [2, с. 24]; *Бабраўнічы* < баброўнік ‘той, хто разводзіць баброў’ [3, с. 241]; *Бондар, Бондараў* < бондар ‘майстар, які робіць бочкі’ [4, с. 395]; *Бортнік* < пчаляр, які займаецца бортнымі пчоламі [4, с. 396]; *Буднік, Будніцкі* < буднік ‘рудакоп’ [2, с. 64]; *Дзегцяроў, Дзегцярэнка* < дзягцяр ‘той, хто гоніць дзёгаць’ [5, с. 178]; *Дудараў* < дудар ‘музыкант, які іграе на дудзе’ [5, с. 207]; *Ганчар, Ганчароў* < ганчар ‘той, хто вырабляе гліняную пасуду [2, с. 101]; *Гутнікаў* < ‘рабочы, які працуе на гуце’ [5, с. 101]; *Кавалёў, Кавалеўскі, Кавальчук, Коваль* < каваль ‘рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу’ [5, с. 570]; *Кажадуб* < ‘дубільшчык скур’ [2, с. 167]; *Кажамякін* < ‘аўчыннік, майстар, які вырабляе шкуры’ [2, с. 167]; *Калеснік, Калеснікаў* < калеснік ‘майстар, які вырабляе колы, калёсы’ [5, с. 586]; *Катляр, Катляроў* < катляр ‘майстар, які вырабляе катлы’ [2, с. 192]; *Кравец, Краўцоў, Краўчанка, Краўчук* < кравец ‘спецыяліст па шыццю адзення’ [5, с. 719]; *Кухараў, Кухарэвіч, Кухарэнка, Кухарэўскі* < кухар ‘повар’ [2, с. 236]; *Кучараў* < кучар ‘фурман, рамізнік, вазніца’ [2, с. 236]; *Мытнік, Мытнікаў* < мытнік ‘зборшчык таможнай пошліны, таможнік’ [2, с. 291]; *Панамар, Панамароў, Панамарэнка* < панамар ‘царкоўны служка’ [3, с. 98]; *Папкоў, Папоў, Попчанка* < поп ‘свяшчэннік’ [6, с. 191]; *Пастухоў, Пастушэнка* < пастух ‘той, хто пасе статак’ [6, с. 92]; *Партны* < партны *рэг.* ‘кравец’ [2, с. 315]; *Пушкарэнка* < пушкар *уст.* ‘артылерыст’ [6, с. 528]; *Руднік* < ‘руднік, той, хто здабывае ці плавіць руду’ [2, с. 555]; *Ткач, Ткачэнка* < ткач ‘рабочы, майстар, які вырабляе тканіну на ткацкім станку’ [7, с. 490]; *Шапавалаў* < шапавал ‘майстар, які вырабляе валеннем шэрсці капелюшы і інш. рэчы’ [7, с. 348]; *Шаўцоў* < шавец ‘майстар па шыццю і рамонту абутку’ [7, с. 490]; *Швец* < швец ‘кравец’ [8, с. 340]; *Шкляр, Шклярэўскі* < шкляр ‘работнік шкляной прамысловасці’ [7, с. 368]; *Шынкар, Шынкарэнка* < шынкар ‘уладальнік шынка’ [7, с. 428].

**Прозвішчы, якія абазначаюць фізічныя і фізіялагічныя характарыстыкі чалавека, рысы характару, уласцівасці розуму, схільнасці і прывычкі** складаюць адну з самых багатых па колькасці груп: *Балабайка* < балабон ‘балбатун, пустаслоў’ [4, с. 329]; *Бамбіза* < ‘рослы, непаваротлівы, няскладны чалавек’ [2, с. 40]; *Бабыр* < *кірг.* ‘гаварун, гаварлівы’ [2, с. 30]; *Балачкоў* < балака *рэг.* ‘балагур, гаварун’, *рус.* ‘балбатун’ [2, с. 37]; *Батура* < ‘балагур’, *рус.* ‘упарты, непаслухмяны’ [2, с. 45]; *Белавусаў* < белыя вусы [4, с. 363]; *Брылеў, Брылёў* < ‘ілгун, абманшчык’ [2, с. 61]; *Бязгубка, Бяздольны, Бязручка, Бязручанька* < які не мае губы, рукі [4, с. 440]; *Варапаеў* < варапаеў *рэг.* ‘смелы чалавек’ [2, с. 82]; *Галавач, Галавачоў, Галаўнёў* < ‘галаваты’ [2, с. 96]; *Гарбач, Гарбачэнка, Гарбачэўскі* < ‘гарбаты’ [2, с. 102]; *Гаркуша* < *рус. гаркуша* ‘крыкун, гарлапан’ [2, с. 103]; *Глушак, Глушакоў* < *рэг.* ‘глухі’ [2, с. 111]; *Жогла* < рэг. ‘ашуканец, круцель’ [2, с. 147]; *Зубаў, Зубаха* < ‘зубаты’ [2, с. 161]; *Кацуба* < ‘той, у каго з рук усё валіцца’ [2, с. 195]; *Карнавушанка, Карнавушка, Карнавушчанка* < карнавухі ‘з абрэзаным або пакалечаным вухам’ [5, с. 644]; *Качура* < *рус. качура, кочура* ‘бамбіза’ [2, с. 196]; *Корзун* < *рус. корзун* ‘без пярэдніх зубоў, шчарбаты’ [2, с. 214]; *Крук, Крукаў, Крукоўскі, Кручкоў* < крук ‘скупец, скупы чалавек’ [2, с. 219]; *Кудраўскі, Кудрачоў* < кудравы ‘кудрач, кучаравы’ [2, с. 226]; *Лёгкі, Лёгенькі* < ад лёгкі [2, с. 251]; *Леўшуноў* < ад ляўша [2, с. 264]; *Лысенка* < ад лысы [2, с. 260]; *Надтачаеў* < *бел.* надтачыць ‘падоўжыць што-небудзь, зрабіць даўжэйшым’ [2, с. 295]; *Носараў* < ‘насаты, насаль’ [2, с. 300]; *Нядбайлаў* < *разм.* ‘нядбалец, нядбалы, лянівы чалавеек’ [9, с. 426]; *Нямкевіч, Нямцоў, Немчанка* < ‘нямы’ [2, с. 202]; *Сівачэнка* < ‘сівы’ [7, с. 126]; *Сляпцоў* < сляпак *разм., зняваж.* ‘сляпы чалавек’ [7, с. 212]; *Філонаў, Філончык* < філон. *жарг.* ‘гультай’ [2, с. 423]; *Ціхановіч* < ад ціхі [2, с. 438]; *Цішкоў, Цішкевіч* < *укр. тишко* ‘ціхоня’ [2, с. 439]; *Чарнышэвіч* < *рус. черныш* ‘смуглы, чарнявы чалавек’ [2, с. 448]; *Буянкоў* < ад буян ‘дэбашыр’ [2, с. 74]; *Гатальскі* < рэг. ‘гаталяй, гуляка’ [2, с. 106]; *Глазуноў* < *рус. глазун* ‘разявяка, той, хто без справы ходзіць і разглядае’ [2, с. 110]; *Дзівакоў, Дзівачэнка* < дзівак ‘чалавек з незвычайнымі схільнасцямі, звычкамі, поглядамі’ [5, с. 172]; *Дзюндзікаў* < *рэг.*

дзюндзік ‘п‘яніца, гультай’ [2, с. 131]; *Мануйленка* < *рус. мануйла* ‘абманшчык, той, хто ўмее выманіць’ [2, с. 274]; *Марчанка* < *рэг.* марчыць ‘мучыць тугою’ [2, с. 277]; *Піскуноў* < піскун ‘той, хто часта пішчыць’ [6, с. 259]; *Сігаеў* < *рус. сигала, сигун, сигач* ‘скакун, прыгун’ [2, с. 373]; *Смірноў* < ад смірны [2, с. 384]; *Суркоў* < ад сурок *перан.* палахлівы чалавек [7, с. 390]; *Цікавец, Цікавенка* < ад цікавы [2, с. 438]; *Шастапалаў* < шастапал ‘які мае шэсць пальцаў’ [2, с. 469]; *Шчарбакоў* < ‘шчарбаты чалавек’ [2, с. 487].

**Назвы жывёл, звяроў, птушак, рыб і насякомых.** Гэта група з’яўляецца адной з важных крыніц для ўтварэння прозвішчаў Кармянскага раёна: *Баран, Баранаў, Быкаў, Бычкоў, Кабан, Кабанькоў, Казлоўскі, Лосеў, Мядзведзеў, Мядзведскі; Баброў, Барсук, Барсукоў, Ваўчкоў, Волкаў, Волчак, Зайцаў, Заяц, Коцур* < *укр. коцур* ‘кот’ [2, с. 216], *Кот, Котаў, Ліс, Лісаў, Лісоўскі, Мышкоўскі, Суркоў, Хамянкоў, Яжоў; Арлоў, Арлоўскі, Бусел, Варабей, Вараб’ёў, Верабей, Гавенька* < гавенька *укр.* ‘варона’ [2, с. 94], *Галкін, Голуб, Голубаў, Голубеў, Гусакоў, Дзяркач* < ‘драч’ [5, с. 182], *Дзятлаў, Драздоў, Драчоў, Жураўлёў, Жураўскі, Кобец* < *укр. кобець* (птушка) ‘кобчык, шулёнак’ [2, с. 210], *Кручкоў* < *рэг. крук* ‘варона’ [2, с. 219], *Лебедзеў, Певень, Пеўнеў, Сакалоў, Салаўёў, Сарокін, Селязнёў, Сокалаў, Уткін, Шпак, Шпакаў, Чайкоў, Чыжыкаў; Акулаў, Акуленка, Акунёў, Бабыр, Карасевіч, Карасёў, Карп, Карповіч, Лешч, Лешчанка, Печкуроў, Плоткін, Сазонаў, Сазаноўскі, Сомаў, Судакоў; Жук, Жукаў, Жукоўскі, Камар, Камароўскі, Мураўёў, Мурашка, Мурашкоў, Мухін, Шаршнёў.*

**Прозвішчы, утвораныя ад назваў прадуктаў харчавання.** У мінулым харчаванне займала важнае месца ў жыцці людзей, што звязана з цяжкай працай. Таму зразумела, чаму ад гэтых назваў утварылася даволі шмат прозвішчаў. Гэта і назвы першых страў, і назвы каш, і назвы страў з мукі. Хлеб з’яўляўся і з’яўляецца галоўным прадуктам харчавання, таму не магло не быць прозвішча, утворанага ад слова «хлеб». Адно прозвішча ўтварылася ад назвы напоя. *Баршчэўскі, Бецін – бець* ‘вялікая булка хлеба’ [2, с. 53]; *Бражны* < брага ‘рошчына з соладу, мукі і бульбы, з якой гоняць спірт’ [4, с. 398]; *Бублікаў, Бурдыгаў* < бурда ‘мутны напітак’ [2, с. 69]; *Калатуша* – калатуша ‘негустая страва з раскалочанай у вадзе ці ў малацэ мукі’ [5, с. 582]; *Журко* < жур ‘негусты аўсяны кісель’ [5, с. 260]; *Калдун, Кісель, Кісялёў, Корж, Каржакоў* < корж ‘прэснае, сухое печыва з мукі; праснак’ [5, с. 714]; *Крупоўскі, Кулага, Кулажанка* < кулага ‘страва з мукі’ [2, с. 228]; *Кулеш, Куляшоў* < кулеш ‘рэдкая мучная каша з салам’ [5, с. 752]; *Куліч* < куліч ‘салодкі здобны пірог цыліндрычнай формы (па праваслаўнаму календару выпякаўся на вялікдзень)’ [5, с. 752]; *Лапуноў* – лапун ‘праснак з бульбы і мукі’ [2, с. 245]; *Лапшын, Масленчанка, Масленка, Прыгара* < *рэг.* прыгарка ‘прыгарэлае месца, прыгарак’ [3, с. 334]; *Саладуха* < саладуха ‘салодкая страва з густазаваранай жытняй мукі’ [7, с. 24]; *Сметанчук, Рабчанка* < рабко ‘страва з пшана і грэцкай мукі’ [2, с. 344]; *Хлебін, Хлебнікаў, Цукараў.*

**Прозвішчы, утвораныя ад назваў абутку і адзення:** *Барукошкаў* < *рус. борушка* ‘жаночы галоўны ўбор’, ‘каўнерык з дробнымі складкамі ў жаночым адзенні’, ‘жаночая сарочка’ [2, с. 43]; *Башмак, Башмакоў, Кобец* < коба *ўкр.* ‘капюшон, башлык у адзенні’ [2, с. 209]; *Кунец, Кунько, Кунцэвіч, Куніцкі* < *рэг.* куна ‘шуба з куніцы’ [2, с. 230]; *Лапцеў* < лапаць ‘абутак з лыка’ [2, с. 246]; *Лёля* < *рэг. лёля* дзіцяч. ‘сарочка, кашулька’ [2, с. 250]; *Сакаўчук, Саковіч* < сак ‘жаночае адзенне’ [2, с. 361]; *Тулупаў* < *рус.* ‘кажух’ [2, с. 417]; *Шчарбак* < *укр.* ‘чаравік з аднаго куска скуры’ [2, с. 487].

**Назвы асоб па адносінах сваяцтва ці становішча ў сям’і:** *Бабіч* < *рэг.* ‘дзіця, якое нарадзілася ў бабкі-павітухі ці ў старой жанчыны’, *рус.* ‘бабнік’ [2, с. 29]; *Бабушкін* < бабушка *рэг.* ‘бабуля’ [2, с. 20]; *Дзедзік, Дзедзікаў* < дзед ‘бацькаў або матчын бацька’ [5, с. 165]; *Ждан, Ждановіч* < ад ждаць ‘чакаць’, ‘дзіця, якога чакаюць, хочуць’ [2, с. 146]; *Карзюк* < *рус. корза* ‘карга, старая баба’ [2, с. 214]; *Малкін* < малка *рэг.* ‘малютка’ [2, с. 271]; *Маліцкі* < *рус. малик* ‘дзіця, малыш, меншы ў сям’і’ [2, с. 271]; *Новік, Новікаў, Навіцкі* < *рэг.* ‘новы чалавек у сям’і’, ‘новы член у сям’і’ [2, с. 294]; *Прыходзька* < ‘той, хто прыйшоў, прышлы’ [2, с. 336]; *Пазняк, Пазнякоў* < *рус. поздняк* ‘апошняе дзіця ў старых бацькоў ці дзіця, якое нарадзілася праз доўгі час пасля папярэдняга’ [2, с. 308]; *Першукевіч* < першы ў сям’і, першынец [2, с. 322]; *Шастак* < шостае па ліку дзіця ў сям’і [2, с. 469].

**Прозвішчы, утвораныя ад батанічных тэрмінаў.** Дадзены падпункт уключае ў сябе прозвішчы, утвораныя ад назваў дрэў, кветак, садавіны і інш.:

*Арбузаў, Бабок, Баравік, Бурак, Буракоў, Бурачонак, Бурачэнка, Бур'ян, Васількоў, Вішнёўскі, Вішнявецкі, Вішняк, Вярбіцкі, Гарбуз, Гарбузоў, Гарошка, Грыб, Грыбоўскі, Дубіна, Дубінін, Дубінскі, Дубкоў, Дубовік, Жолуд, Жолудзь, Жытнік, Жытнікаў, Калінін, Капусцін, Кедраў, Лазоўскі, Ліпаў, Ліпскі, Ліпаўскі, Маліноўскі, Плюшчаў, Пшанічнік, Пшаноў, Саснок, Сасноўскі, Суржык, Травінчык, Травулька, Траўнік, Хмялеўскі, Цыбульскі, Яворскі* < 'ад явар' [2, с. 498]; *Ярэц* < *укр. ярець* 'ячмень' [2, с. 500].

**Прозвішчы, утвораныя ад назваў народаў і этнічных груп:** *Літвінаў, Літвіненка, Літвінчук* < ліцвін , *ст. бел. літовец* 'жыхар Літвы' [2, с. 253]; *Мазур, Мазуркевіч, Мазурэнка* < мазур 'выхадзец з Мазуршчыны' [2, с. 267]; *Маскаленка* < маскаль 'падданы Маскоўскай дзяржавы' [2, с. 277]; *Прус, Прусак* < 'ураджэнцы або жыхары Прусіі; паўночна-ўсходнія немцы' [6, с. 402]; *Шведаў* < швед 'народ скандынаўскай групы, які складае асноўнае насельніцтва Швецыі' [8, с. 363].

**Назвы частак цела і покрыва чалавека і жывёл.** Прозвішчы, звязаныя з асобнымі часткамі чалавечага цела былі даволі папулярнымі. У якасці прозвішч маглі выкарыстоўвацца і назвы частак цела жывёл: *Бязгубка, Бязручка, Валасевіч, Галавін, Галавачэнка, Галоўка, Галоўчанка, Гарбуноў, Гарло, Горленка, Гуз, Гузаў, Гулянкоў* < гуля 'гуз, жаўлак' [5, с. 95]; *Дзюба, Дзюбко, Зубаў, Капыткоў, Крылоў, Лапін, Лапіцкі, Лапкоўскі, Маслак* < маслак 'вялікая косць, пераважна сцегнавая; вытырклая косць' [9, с. 117]; *Пузік, Пузан* < пуза 'жывот чалавека або жывёлы' [9, с. 117]; *Ражкоў, Рагоўскі, Рогаў, Ус, Усевіч, Усікаў, Ушкін, Шкурко, Шкурын, Шкуратаў.*

**Прозвішчы, утвораныя ад геаграфічных назваў** складаюць невялікую па колькасці групу: *Аршанскі* (г. Орша), *Барысавец* (г. Барысаў), *Вялікаборац* (в. Вялікі Бор), *Дземяхоўскі* (в. Дземяхі), *Дубавец* (в. Дубы, Дубава), *Пінскі, Пінчук* (г. Пінск), *Паляшук* (Палессе), *Слонімскі* (г Слонім), *Прылуцкі* (г. Прылукі), *Туравец* (г. Тураў), *Бакавец* (в. Бакі, Бакава), *Гарыводскі* (в. Гарывада), *Палтавец* (г. Палтава), *Петрыкавец* (г. Петрыкаў), *Цеснавец* (в. Цясны), *Шыхавец* (в. Шыхава).

Такім чынам, аналіз вышэй разгледжаных прозвішчаў дае нам магчымасць сцвярджаць, што самай прадуктыўнай матывацыйнай базай для ўтварэння прозвішчаў Кармянскага раёна з'яўляецца апелятыўная лексіка, якая прадстаўлена рознымі лексіка-семантычнымі групамі. Найбольш пашыранымі з'яўляюцца прозвішчы, утвораныя ад назваў асоб па прафесіі, фізічных і фізіялагічных характарыстык чалавека, асаблівасцей характару, яго схільнасцей і прывычак. Менш пашыраны прозвішчы, суадносныя з назвамі абутку і адзення, з батанічнымі і геаграфічнымі назвамі.

## Літаратура

1. Суперанская, А. В. Современные русские фамилии / А. В. Суперанская, А. В. Суслова ; под. ред. Ф. П. Филина. – М. : Наука, 1981. – 176 с.

2. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія 2 : Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.

3. Унбегаун, Б. Русские фамилии / Б. Унбегаун ; пер. с англ. ; общ. ред. Б. А. Успенский. – М., 1989. – 443 с.

4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1977. – Т. 1 : А–В. – 608 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1978. – Т. 2 : Г–К. – 768 с.

6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1980. – Т. 4 : П–Р. – 768 с.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1982. – Т. 5, ч. 1 : С–У. – 663 с.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1984. – Т. 5, ч. 2 : У–Я. – 608 с.

9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1979. – Т. 3 : Л–П. – 672 с.

Гомельский государственный технический
университет имени П.О. Сухого

Поступила в редакцию 01.12.2023